Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»
Інстытут інклюзіўнай адукацыі
Кафедра лагапедыі

## Навучальная дысцыпліна «Гісторыя логапедагогікі»

# Тэма: «Данавуковы перыяд развіцця спецыяльнай педагогікі і першыя згадкі пра маўленчыя парушэнні (з антычных часоў да XIV ст.)»

Сімчанка К.В.

выкладчык кафедры лагапедыі

**Першыя звесткі пра парушэнні маўлення, іх этыялогію і прыёмы пераадолення ў крыніцах старажытнаегіпецкай культуры, медыцынскіх трактатах старажытных індусаў і кітайцаў, працах філосафаў, медыкаў Старажытнай Грэцыі, Старажытнага Рыма, Візантыі і Арабскіх халіфатаў, рэлігійнай літаратуры.**

**Старажытны Усход.** Да краін Старажытнага Усходу прынята адносіць Вавілонію, Асірыю, Егіпет, Індыю, Кітай (4 – 2 тыс. да н.э.), Грэцыю (5 – 4 ст. да н.э.), Рымскую імперыю (2 ст. да н.э. – 2 ст.н.э.). Ужо за некалькі тысячагоддзяў да н. э. у народаў Старажытнага Усходу ўзнікаюць і складаюцца ў пэўнай сістэме навуковыя ўяўленні. Разгледзім погляды на маўленчыя парушэнні ў некаторых краінах.

**Егіпет (4 тыс. гадоў да н.э.).** Культура Старажытнага Егіпта пакінула глыбокі след у гісторыі сусветнай культуры. Нараўне з матэматычнымі, астранамічнымі і іншымі ведамі егіпцяне валодалі ведамі і ў медыцыне. У адным з найстаражытнейшых папірусаў (да нас дайшло 4), у папірусе Эдмана Сміта, знаходзім першую згадку пра маўленчыя парушэнні, звязаныя з фізічнай траўмай.

Вось апісанне безнадзейнага выпадку, калі чалавек страціў слых, гаворку, кантроль над рукамі і нагамі.

Тут лекар кажа: «Я не буду яго дакранацца». Затым 2 заўвагі: адзін пазванок уціснуты ў другі, гэта здарылася таму, што чалавек упаў уніз на сваю галаву.

У гэтым жа трактаце ўпершыню сустракаецца згадка пра мозг, аўтар звяртае ўвагу на лакалізацыю мазгавых функцый - на сувязь мазгавой дзейнасці з кіраваннем канечнасцяў. На падставе гэтага выпадку А. Р. Лурыя выказаў здагадку, што ў дадзеным папірусе ўпершыню апісана траўматычная татальная афазія.

**Індыя.** У святой літаратуры («Ведаў»), асаблівае месца займаюць трактаты «Аюрведы». У індусаў у «Аюрведах» медыцына з'яўляецца аддзелам рэлігіі. Тракт складаецца з 6 частак. У адной з іх апісваецца 2 пластычныя аперацыі - лячэнне «заячай губы» і «воўчай зяпы» - хейлапластыка і уранапластыка. **Кітай.** Аб моўных парушэннях у кітайскай літаратуры мы знаходзім звесткі ў працах рускага лекара П.Я. Пясецкага. Ён адзначае: «З прыроджаных недахопаў найбольш часта ёсць заячая губа».

**Рэлігійныя міфы і паданні.** Вывучаючы літаратуру Старажытнага Усходу варта звярнуць увагу на рэлігійныя міфы і паданні, дзе ёсць своеасаблівае згадванне пра маўленчыя парушэнні і прыёмы іх лячэння. У «Бібліі» (Стары Запавет) ёсць згадка пра цяжкую мову прарока Майсея, які заікаўся і казаў незразумела.

Цікавая версія аб прычыне заікання. Дачка фараона прынесла да свайго бацькі маленькага Майсея з просьбай усынавіць яго. Фараон узяў немаўля да сябе на калені і паклаў на яго галаву сваю карону. Майсей сарваў карону і пачаў здзеквацца з яе. Дарадца фараона ўбачыў у гэтым дрэннае прадвесце, раіў забіць Майсея. Але адзін саветнік заступіўся. Параіў паказаць золата і падпаленае вуголле, што ён выбера. Майсей, натуральна, хацеў выбраць золата, што яго загубіла б, выратаваў анёл, які накіраваў яго руку да вуглёў. Майсей пацягнуўся да іх і паднёс да рота. З таго часу Майсей пачаў цяжка гаварыць.

Такім чынам, «у помніках даўніны» Старажытнага Усходу знаходзілі згадванне пра такія маўленчыя парушэнні:
- страта слыху, кантролю над рухам рук, ног;
- раптоўныя страты гаворкі, немата (з захаваным слыхам);
- глухата (з захаваннем маўлення);
- расколіны вуснаў і нёба;
- заіканне, коснамоўе, немата з-за нервовага ўзрушэння.

Цікавасць да маўленчых парушэнняў спарадзіла жаданне зразумець іх прычыны. У асноўным гэта тлумачылася ўплывам звышнатуральных сіл.

**Старажытная Грэцыя і Рым.** У гэтых дзяржавах пытаннямі выхавання, лячэння чалавека займаліся ў асноўным філосафы, медыкі і аратары. У іх працах знаходзяць згадку аб тым, як выхоўваць правільнае маўленне. Спынімся на ўяўленнях дадзенага часу і разгледзім іх пункты гледжання.

**Дэмакрыт** (5 - 4 стагоддзе да н.э.) - матэматык, фізік, анатам, медык, гісторык. У аснове свету ляжыць не бог, не дух, а матэрыял. Дэмакрыт адным з першых узняў пытанне аб прыродазгоднасці выхавання. «Добрымі людзі становяцца больш ад практыкавання, чым ад прыроды».

Заслуга - вялікае значэнне ў працэсе выхавання належыць практыкаванням, важнасць прыкладаў для дзіцяці. Роля правільнага выхавання ў папярэджанні маўленчых парушэнняў.

**Платон** (5 - 4 ст. да н.э.) - ідэаліст. Прычыны хваробы ён бачыў у пакаранні, пасланым з неба. У Платона таксама знаходзім адлюстраванне праблем агульнага выхавання дзяцей. Вялікае значэнне ў выхаванні надаваў гульні.

Першая ж згадка пра маўленчыя парушэнні ў літаратуры Старажытнай Грэцыі ёсць у **Герадота** (425 г. да н.э.). Апісаў прамову цара Бата (казаў хутка, невыразна, спатыкаўся, недагаворваў канчаткі слоў). Лічаць, што «баттарызм» вытворнае ад імя цара. Упершыню найболей поўныя і сістэмныя звесткі аб маўленчых парушэннях мы сустракаем у старажытнагрэчаскага лекара і прыродазнаўцы, заснавальніка антычнай медыцыны – **Гіпакрата** (439 – 377 гг. да н. э.).

Для Гіпакрата хвароба з'яўляецца праявай жыцця арганізма, а не праявай боскай волі, злога духу. У яго ёсць згадка пра шматлікія, вядомыя нам цяпер маўленчыя паушэнні: страта голасу, страта гаворкі, коснамоўе, невыразная гаворка, заіканне. Навуковец падкрэслівае галоўную ролю мозгу ва ўсёй дзейнасці чалавека. «Калі мозг адчувае страсенне і пакутуе ад удару, хворы абавязкова губляе гаворку, не бачыць і не чуе».

Заслуга Гіпакрата ў наступным:

1) спроба класіфікаваць маўленчыя парушэнні;

2) галоўная роля мозгу;

3) апісанне органаў і функцый слыху, зроку, голасу і гаворкі (роля паветранай бруі, языка, голасу, артыкуляцыі і гукаўтварэння);

4) апісанне асобных парушэнняў слыху, голасу і гаворкі;

5) рэкамендаваў выкарыстоўваць пры дыферэнцыяльнай дыягностыцы розных хвароб асаблівасці парушэнняў слыху, голасу і гаворкі.

**Арыстоцель** (384 - 322 гг. да нашай эры). Арыстоцель сын лекара. Атрымаў медыцынскую адукацыю. Зыходзячы з параўнальнай анатоміі органаў артыкуляцыі ў розных прадстаўнікоў жывёльнага свету, ён заключыў, што для ўтварэння выразнай мовы неабходны зручны, рухомы, мяккі, доўгі і шырокі язык. Патрэбны вільготныя вусны пры нешырокай адтуліне рота і неабходна наяўнасць зубоў. Арыстоцель бачыў прычыну недахопаў гаворкі ў няправільнай структуры ці недастатковай рухомасці органаў артыкуляцыі. Ён бачыў прычыну маўленчых парушэнняў у няправільным функцыянаванні перыферычнай часткі маўленчага апарата. **Плутарх** (каля 46-120 гг.) апісваў сістэму спартанскага выхавання, у сваіх працах звяртаўся да сістэмы развіцця гаворкі ў юных спартанцаў. Плутарху належыць таксама адно з найбольш поўных апісанняў дэфекту гаворкі, на які пакутаваў бліскучы старажытнагрэчаскі аратар і палітычны дзеяч Дэмасфен (384 – 322 гг. да нашай эры).

Па дадзеных І. А. Сікорскага (1889), бліскучы аратар старажытнасці **Дэмасфен** сапраўды пакутаваў на заіканне. Прычым маўленчыя сутаргі ў яго былі настолькі моцныя, што адлюстроўваліся нават на яго жэстах. Дэмасфен сам абраў шлях збавення ад заікання. Ён азначыў цэлую сістэму розных маўленчых практыкаванняў. У іх ён прадугледжваў не толькі рэгулярную трэніроўку правільнай гаворкі, але і выхаванне ў сабе пэўных рыс асобы.

У маўленчых практыкаваннях ён вялікае значэнне надаваў развіццю дыхання, імкнучыся падпарадкаваць яго сваёй волі і кантролю. Ён затрымліваў дыханне, прамаўляў доўгія фразы на адным выдыху, гучна дэкламаваў, вершы. Каб развіць сілу і каардынацыю рухаў маўленчага апарата, ускладняў іх тым, што пры маўленчых практыкаваннях трымаў у роце дробныя каменьчыкі. Пад час заняткаў Дэмасфен ставіў задачу пераадолець нясмеласць, страх, збянтэжанасць, выкліканыя прысутнасцю іншай асобы або грамадства, таму ўсе свае практыкаванні Дэмасфен рабіў ля мора, бо зменлівая хвалюючая карціна мора супастаўлялася ў яго з уяўленнем аб неспакойным і шумлівым натоўпе. Маўленчыя заняткі праводзіў у прысутнасці староннікаў асоб. Такім чынам, Дэмасфен пераадолеў свой маўленчы дэфект. Нажаль гісторыя не захавала цалкам плана лячэння Дэмасфена.

Шмат цікавых звестак аб маўленчых парушэннях было знойдзена ў працах вучоных **Старажытнага Рыма**. Адным з навукоўцаў Старажытнага Рыма быў **Ава Карнэлій Цэльс** (30-25 гг. да н.э. - 40-45 гг.). Ён апісаў захворванні звязаныя з паралічом языка, з прырастаннем кончыкам языка да ніжняй часткі ротавай поласці. Пісаў пра меры лячэння гэтых выпадкаў.

Цэльс бачыць прычыну парушэнняў гаворкі ў парушэнні структуры або рухомасці перыферычнай часткі рэчарухальнага механізму і рэкамендуе ў якасці прыёмаў ліквідацыі хірургічныя, тэрапеўтычныя сродкі і маўленчыя трэніроўкі.

**Клаўдзій Гален** (каля 130-200 гг.) - Вялікае значэнне надаваў галаўному мозгу ў забеспячэнні маўленчай дзейнасці. Ім былі апісаны мазгавыя абалонкі, мазжачок, чэрапна-мазгавыя і спіннамазгавыя нервы. Гален адрозніваў 7 пар чэрапна-мазгавых нерваў. Ён таксама вызначыў, што перарэзка спіннога мозгу на пэўным узроўні вядзе да парушэння рухальных функцый (параліча канечнасцяў і інш.), паралічу дыхальных мышцаў; перарэзка блукаючага нерва - да страты голасу, адчувальнасці.

І.А. Сікорскі адзначаў, што Галену належыць заслуга выпрацоўкі дакладнай навуковай тэрміналогіі хвароб маўлення, ён канчаткова ўводзіць значэнне найгалоўнейшых тэрмінаў: афазія, афанія, заіканне, коснамоўе, невыразная гаворка.

Гален падзяліў парушэнні маўлення і голасу. Першыя паходзяць ад "пакуты" гартані і яе мышцаў, другія - ад пашкоджання языка, вуснаў, нёба і г.д. Пры гэтым звятаў увагу на залежнасць некаторых парушэнняў гаворкі ад пашкоджанняў ЦНС. Упершыню ён зазначыў прычыны парушэнняў маўлення цэнтральнага і перыферычнага характару.

**Марк Фабій Квінтыліян** (42—118 гг.) — прамоўца і тэарэтык аратарскага мастацтва, буйны прадстаўнік педагагічнай думкі. Ён надаваў вялікае значэнне развіццю гаворкі дзіцяці з ранняга ўзросту. Вывучэнне мовы і музыкі, на яго думку, садзейнічае выпрацоўцы добрага вымаўлення, паляпшае стыль гаворкі, робіць яе больш выразнай. Квінтыліян звяртаў увагу на неабходнасць правільнага маўленчага асяроддзя дзіцяці, на своечасовую ліквідацыю ў яго дэфектаў гукавымаўлення.

**Візантыя, Арабскія халіфаты, Сярэдняя Азія**

Візантыя - захавала старажытную культуру антычнага свету. Лекары Візантыі добра былі знаёмы з творамі лекараў Грэцыі і Рыма. Лекар **Арыбадзій** (326 – 403), энцыклапедыст **Аэцый Амідскі** (527 – 565), **Павел Эгінскі** (425 – 490) разглядалі хваробы маўлення як хваробы языка, яго аброці, прапаноўвалі хірургічнае ўмяшанне.

У плане тэрапіі заікання **Арыбадзій** прапаноўваў наступнае:

1) прамаўляць на памяць урыўкі лірычнага характару, пачынаючы з нізкага тону, затым павышаючы голас і зноў паніжаючы;

2) чытанне пачынаць з урыўкаў на памяць;

3) у гаворкі рабіць глыбокі ўдых;

4) гаворка пад такт і інш.

**Ібн-Сіна (Авіцэна) (**980—1037 гг.) — найбуйнейшы вучоны свайго часу, філосаф, доктар, прыродазнаўца і паэт народаў Сярэдняй Азіі. Сусветную славу яму прынёс «Канон врачебной науки» - энцыклапедычны збор медыцынскіх ведаў старажытнага свету. У «Каноне» маюцца звесткі аб парушэннях гаворкі і аб спосабах іх лячэння. Ібн-Сіна робіць акцэнт на значэнне розных органаў артыкуляцыі ў акце гаворкі, аб магчымай паталогіі ў іх структуры і функцыях, і ў сувязі з гэтым аб магчымых маўленчых парушэннях. Адначасова з парушэннямі перыферычнай часткі маўленчага апарата Ібн-Сіна бачыў магчымасць пашкоджання і яго цэнтральнай часткі, што таксама прыводзіць да розных парушэнняў маўлення. Авіцэна рэкамендуе наступнае лячэнне парушэнняў гаворкі: пускаць з сасудаў языка кроў, рухальныя практыкаванні для языка, церці язык нашатырам з сушаным кіслым малаком, паласкаць горла перцам, гарчыцай, шараваць язык звязваючымі лекамі і т. д.

Своеасаблівы погляд Авіцэны на прычыну і ўстраненне заікання. Ён піша: «Прычына парушэння маўлення закладзена ў мышцы гартані, калі ў ёй мае месца нацяжэнне або расслабленне. Здараецца, што чалавеку спачатку цяжка выдаваць гукі, бо ён узмоцнена імкнецца прывесці ў рух мышцы грудзей і гартані, а гэтыя мышцы не слухаюць намаганні і не падпарадкоўваюцца ім. Такому чалавеку варта, збіраючыся пачаць казаць, зрабіць глыбокі ўдых і шырока расправіць грудзі, прычым ён павінен казаць павольна. Калі ён прывыкне да гэтага, яму будзе лёгка казаць, і лёгкасць гаворкі стане для яго звычайнай». Такім чынам, Ібн-Сіна разглядае цэнтральныя і перыферычныя прычыны ўзнікнення розных маўленчых парушэнняў і адпаведна гэтаму прапануе і розныя сродкі іх пераадолення. Можна меркаваць, што пункт гледжання Ібн-Сіны на маўленчыя парушэнні адпавядае поглядам лекараў Еўропы XI-XVIII ст.

**Выкарыставаная літаратура:**

1. Малофеев, Н.Н. Специальное образование в России и за рубежом: в 2 ч. /Н.Н. Малофеев. – М.: Печатный двор, 1996. – 182 с.

2. Селиверстов, В. И. История логопедии. Медико-педагогические основы [Электронный ресурс]: учебное пособие для вузов / Селиверстов В.И.— М. : Академический Проект, 2016.— 384 с.

***Дзякую за ўвагу!***